Год II Аўторак, 24 студня 1922 г. № 16 (25)

РАНІЦА

штодзенная грамадзкая, палітычная і літэратурная газэта

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ:
Вільня, Вострабрамская № 4, „Hotel Szlachecki“ пак. № 2.
Рэдакцыя адчыняна што дня, апрача сьвят, ад 11 да 1 і ад 5 да 7 гадз.

Цана нумару 20 марак.
Падпіска на 1 мес. . . 400 марак.
З перасылкай 1 „ . . 500 „
За граніцай ў два разы даражэй.

ЦАНА АБВЕСТАК:
За адзін радок звычайнага друку на 1 стр.—60 м.
ў тэксьце . . . . 75 м.
за тэкстам . . . . 40 м.
Для шукаючых працы на 10 прац. таней.

Вільня, 24 Студня 1922 г.

Няма нічога дзіўнага ў тым, што амаль ня ўся Эўрапейская прэса найболей ўвагі зьвертае на пытаньне аб Англа-Францускім хаўрусе і аб прэдстаячай Гэнуэскай канфэрэнцыі.

Быў мамэнт, калі пасьля адстаўкі Брыана, здавалася, што Англа-Француські хаўрус вісіць на паветры. Але цяпер, калі сам Пуанкарэ—як апавясьцілі тэлеграмы—едзе ў Лёндын, каб дагаварыцца аб варунках хаўруса, Эўропы можа быць пэўнай, што такі хаўрус у недалёкай будучыне ўсе-ж будзе, ня гледзячы навет на тое, што англійская рабочая партыя адкрыта выступіла проці гэтага хаўруса.

Адзін з выбітнейшіх членаў англійскай рабочай партыі Роберт Крайнсі ў сваей прамове ў Манчэстэру на конта Англа-Францускага хаўруса сказаў гэтакія словы: „Англія ня можа пазволіць сабе раскошы заключэньня новых ваенных ці іншых згаджэньняў, магучых цяжка адазвацца на эканамічных варунках Англійскай дзяржавы. Мы маем найлепшыя пачуцьця да Францыі, але ня можам нясьці на сабе цяжар абмылковай палітыкі Францускага Ураду, не нашоўшага агульнай мовы з Германіей і Расеей... Будучая палітыка Велікабрытаніі павінна дамагацца заключэньня згаджэньняў з усімі Эўропейскімі дзяржавамі, альбо адхіліцца ад уселякіх згаджаньняў... Мы павінны ўсімі сродкамі вясьці барацьбу проці гібельных пляпаў ствараньня новых кааліцый дзеля барбы з групіроўкамі іншых дзяржаў“...

З гэтага відаць куды, ў які бок направлены ўсільля англійскай рабочай партыі, з якой Лёйд-Джордж rolens nolens павінен лічыцца.

Як на гэта будзе рэагіраваць Францыя—іншая рэч.

Пуанкарэ—гаворучы аб сваёй палітычнай праграме, між іншым, выказаў: „ў цяперашні палітычны момант ён з'яўляецца рашучы старонікам цеснага хаўруса з Англіей. Главная мэта яго палітыкі—ліквідаваць тыя небясьпекі, якія могла вызваць у Англіі адстаўка францускага габінэту.

Плян заключэньня хаўрусаў з Англіей застаецца той самы. Розніца яго палітыкі з палітыкай Брыана будзе ня столькі ў мэтах сколькі ў мэтодах. Усе непаразуменьня будуць абгавораны і ліквідаваны, тады і хаўрус будзе мацнейшы“...

„Што трэба Францыі?“ Пытае Пуанкарэ, і дае адказ: „Адбудаваць зьнішчапае і забяспечыць сваю нацыянальную безапасьнасьць, і ў гэтай справе Францыя спадзяецца на падтрыманьне Англіі. А ў замен гэтага Францыя гатова працаваць са сваімі прыяцельмі і хаўруснікамі над умацаваньнем міра пры варунках, што яны будуць паважаць права Францыі, ўмоцненыя мірнымі ўстановамі...“

Вось якой праграмы трымаецца той вялікі чалавек, які ўзяўся кіраваць палітыкай Францыі. І ўсе прыяцелі і хаўруснікі Францыі могуць быць пэўнымі, што Пуанкарэ не на адзін крок не сайдзе з таго палітычнага шляху па якому ён ідзе.

Гэты шлях не па густу Лёйд-Джорджу. Гэты шлях не падабаецца англійскім рабочым і заўсім непрыемны для немцаў і бальшавікоў.

Бальшавікі лічылі, што Генуэская эканамічна-фінансавая канфэрэнцыя будзе для іх вельмі карыснай, што пры падтрыманьні Вялікабрытані, савецкая ўласьць будзе прызнапа на канфэрэнцыі і гэтае прызнаньне памо..а ім пашырыцца на Захад.

Паяўленьне на палітычнай арэне чэснага і цьвёрдага як сталь Пуанкарэ, разьбіла маскоўска-балшавіцкія пляны. Не апраўдаліся і германскія надзеі...

Францыя ў асобе свайго Вялікага Палітыка сумее знайсьці добры і выгадны для сябе і для сваіх прыяцеляў і хаўруснікаў выхад з саздаўшайся палітычнай кан'юнктуры.

Палітыка Францыі будзе палітыкай цьвёрдай і моцнай, палітыкай ўраду, апіраючагася на пажаданьні ўсей нацыі, добра ведаючай свае права і гатовай з усей рашучасьцю і сілай падтрымаць гэтае права.

Гегемонія Англіі, з адстаўкай Брыана і паяўленьнем у власьці Пуанкарэ, застаецца пустым гукам.

Лёйд-Джордж гэта ўжо пачуў. Адсюль чуткі пакуль што няверныя, аб яго адстаўцы.

✦✦✦✦

ТЭЛЕГРАМЫ.

МАСКВА 22. І. (А. В.) Дня 18 гэтага месяца ў Маскве ствярылася фінскае тэлеграфічнае таварыства, якое мае ў мэце к злучэньню телеграфу паміж Расеяй і Эўропай праз Фінляндыю.

МАСКВА 22. І. (А. В.) Дня 20 гэтага месяцу выехалі з Масквы да Варшавы разам Стэфанскі і Карахан.

МАСКВА 22.І. (А. В.) Савецкі ўрад сабраў спэцыяльную вайсковую камісыю, маючы ў мэце ўстановы новае формы абмундураваньня чырвонай арміі. Застануцца старыя назвы дзеля ступеняў афіцэрскіх чыноў. Замест эпалетаў будзе ўстанаўлена насіць на плечох плецёнкі з золата дзеля афіцэраў, а дзеля жаўнераў серэбраныя плецёнкі. Афіцэрам будуць апрэдзеляны ардынанцы.

ЛЬВОУ 22. І. (А. В.) На камуністычным з'ездзе ў Екатэрынаславу разглядалася паданьне вядомага Махно, які хоча зьвярнуцца да Расеі, і абяцае трымацца лаяльнасьці да Савецкага ўраду. Але гэтая прозьба Махно на з'ездзе была адкінута.

ЛЕНДЫН 22. І. (А. В.) Ходзяць пагалоскі, што дымісыя Лёйд-Джорджа не мае падставы. Лёйд-Джордж на выпадак дымісыі пагражае распусьціць парлямэнт.

ГЕЛЬСІНФОРС 23.1. (А. В.) З Пецэрбургу паведамляюць, што аглошана рэгістрацыя ўсіх афіцэраў да 65 гадоў. Гэта распараджэньне зроблена па прычыне паўстаньня ў Карэліі, а так сама ў мэпе зрабіць ліквідацыю бандыцкага руху на Украіне.

МІНСК 23.1. (А. В.) У апошніх тыднях хлеб падаражэў ў Меншчыне на 100 проц., тлустасьць яшчэ больш.

ХАРКАУ 23.1. (А. В.) „Извѣстія“ павядамляюць, што прафэсар Мануільскі найшоў становішча ў Савецкай Украіны ў харчавых адносінах вельмі крытычным. Ужо напрыклад у губ. Адэскай здараліся выбадкі галоднай сьмерці. Жывёла падае масамі. Становішча з харчамі ў Данецкім цэнтру яшчэ горшае.

КРАКАУ 23.1. (А. В.) Д-р Якуб „Тогк прэзас“ жыдоўская народавае рады ў Палестыне асьвяціў прадстаўнікам прэсы аб каласальных закупах у Ерусаліму. Належную суму ў ліку 3 мільярдаў марак пакрыў жыдоўскі народовы фонд.

БЭРЛІН. 23. І. (А. В.) У Дрэздэну ўчора пачалася жалезна-дарожная забастоўка. Жалезнадарожныя служачыя на Ліпску і Хэмнітзу і іншых вузлоў абецалі памачы дрэздэнскім служачым.

МІЛАН 23. І. (A. W. „Covvieve della Sevva“ запэўняе, што прэзыдэнт Гардынг, маючы пад увагай міжнарадовае грашавое пытаньне пастанавіў ўзяць на сябе прысутнасьць на Гэнуэскай канфэрэнцыі пры трох асноўных варунках: 1. Прысутнасьць Расеі на канфэрэнцыі ня будзе мець вынікам прызнаньня дзяржавамі ўлады Саветаў. 2. Сукапугныя ўкрапленьня будуць аграпічаны згодна жаланьню Амэрыкі.

3. Пытаньне аб даўгох Эўрапейскіх Дзяржаў, ў Амэрыцы зусім ня будзе тэмай пасяджэньняў канфэрэнцыі.

ПАРЫЖ 23. І. (А. В.). У зьвязку з ад'ездам Пуанкарэ да Лёндыну, француская прэса адзначае надзею, што англа-француські трактат распачаты Брыанам прыведзе без сумленьня да добрага рэзультату.

ПАРЫЖ 23. І. (А. В.). Заўтра выезджае да Лёндына Пуанкарэ ў мэце паразуменьня з Лёйд-Джорджам на конга стварэньня англа-францускага хаўруса, і на конта прызнаньня Савецкага Ураду эўропейскімі гаспадарствамі.

БЭРЛІН 23. І. (А. В.). Нямецкі ўрад апрацаваў мэморыал у якім адзначыў агульнае фінансавае становішчэ Нямеччыны, атак сама аб зьмене сыстэмы падаткаў і звароту нямецкіх банкнотаў. Мэморыал меў ў мэце зрабіць адсрочку тэрмінаў нямецкіх выплатаў.

МАСКВА 23. І. (А. В.). „Извѣстія“ надрукованы гэткія цэны на харчы; істнуючыя у астатні час у Маскве: фунт чорнага хлеба 4400 рублей, фунт прасеянага хлеба 15.500 р., фунт сялядцоў 10.000 кавалак мыла 25.000 р., 25 папяросаў 10.000 р., цёплая кашуля ад 25.000 да 600.000 р., бракоўныя боты 300.000 р.,

МАСКВА 23. І. (А. В.). На дзень 1 лютага г. г. у Маскве будзе зкліканы ўсерасейскі з'езд земляробаў.

✦✦✦✦

Сьмерць Святога Айца.

Бюро Вольфа паведамляе, што 21 студня на раніцэ Папа ўмёр.

Афіцыяльнага падцвярдзеньня сьмерці св. айца да гэтага часу няма.

Тэлеграмы паведамляюць, што ў астатнюю ноч дактары ня адхадзілі ад ложка Папы. Біскуп Мігнон адслужыў мшу in artykulo mogetis у капліцы суседней з пакоем Папы.

А гадзіне другой ў ночы Папа страціў прытомнасьць. А дзьвенаццатай гадзіне ў дню пачалася агонія. Дактары кажуць, што агонія працягнецца доўга (А. В.).

З Ведэна паведамляюць, што там ня адтрымалі вёсткі аб сьмерці св. Айца.

„Бюро Корэс.“ даносіць, што ў 7 гадз. у вечары наступіла сьмерць, іншыя агенцыі прыслалі аналагічныя паведамленьня (А. В.).

З Рыму павядамляюць, што 21 студня ўпоўнач скончыўся Папа Бэнэдыкт XV.

Да самай сьмерці Папа сахраняў поўную прытомнасьць і пасьля св. Прычасьця яшчэ некалькі хвіль гаманіў з кардыналам Гаспары.

Спачыўшаму Папе Бэнэдыкту XV скончылася 68 гадоў. Быў выбраны на Папскі прастол у верасьні 1914 г. Усім добра ведама яго роль у час вайны—яго стараньня, направленыя ў бок заключэньня міру, помачы народам пастрадаўшым у час вайны, і Пастырскія адзыўчывыя адносіны да галадаючых у Расеі.

Весткі з Варшавы.

Рада Міністраў прыняла прапазыцыю аб частковай адмене ваена-палевых судоў ў 32 паветах Польскай Рэчы Паспалітай (А. В.).

Премі́ер-міністар Панікоўскі прыняў сяброў прэзыдыума Польскай Краёвай Сувязі, якія падалі мэмарыал, выясьняючы патрэбы Крэсаў Усходніх.

П. Панікоўскі асьвецчыў дэлегацыі аб тым, што калі сэсія сойму працягнецца да лета, дык ён внясе ў сойм праэкт аб выбарах ў Варшаўскі Сойм на Крэсах.

Згодна гэтаму выбары ў Варшаўскі Сойм на крэсах адбудуцца ў кветню г.г.



Нота Савецкага Ураду.

Савецкі Урад уручыў Фінляндскаму Ураду ноту, ў якой трэбуе ў пайхутчэйшы тэрмін разаружыць карэльскіх паўстанцаў, ўцякачоў і прыбываючых у Фінляндыю з Карэлії і інтэрнаваць тых, якія прыймалі ўчасьце ў паўстаньні.

Нота трэбуе узварота Расеі аружжа, аднятага ад паўстанцаў, дзеля таго, што Фінляндыя заўсёды заяўляла, што яна не падтрымывае паўстанцаў і аружжа паўстанцы адтрымалі не ў Фінляндыі, а ў Расеі.

Далей Савецкі Урад прапануе арганізаваць арбітражную Камісыю з чатверох незаінтэрэсаваных асоб, назначаных ад Расеі і Фінляндыі пораўну.

У канцы ноты Савецкі урад трэбуе зьніштожыць у Фінляндыі ўсе расейскія „контр-рэвалюцыйныя“ арганізацыі.

Адным словям нота з'яўляецца выразным абразчыкам Чычэрынскай палітыкі, з якой ужо добра пазнаёмілася Польшча. Якую адповедзь дасьць Фінляндыя—пакажа недалекае будучае.



Навіны у тры радкі.

Англія, Францыя і Японія ўнясьлі да Кітая прапазыцыю аб зьменшэньні рэгулярнай арміі.

6 лютага ў Рызе адбудзецца жалезнадарожная канфэрэнцыя па пытаньню аб устанаўленьні безпасрэдняй камунікацыі Рыга—Варшава—Прага.

На конфэрэнцыі прысутнымі будуць прадстаўнікі ад Польшчы, Эстоніі, Літвы і Чэхо-Славакіі.

З Кіева паведамляюць, што бальшавікі сдалі ў арэнду прыватным асобам 1.218 млыноў.

У Саўдэпіі выдан дэкрэт забараняючы ўвоз „белых“ газэт на тэрыторыю Савецкай Расеі.

У Севастопалі на днях расстраляны 85 рабочых, якія прымалі ўчасьце ў маніфэстацыі дабіваючыся хлеба, мяса і свабоды.

З Стокгольму тэлеграфуюць, што амаль ня палавіна насяленьня горада хварэе на грып.

Літоўскае міністэрства ўнутрэніх справаў афіцыяльна абвесьціла, што ў гарадох: Коўна, Шаўлі і Паневеж з паветамі і Ракішскі павет з'явілася эпідэмія тыфусу. Дзеля гэтага абвешчана мабілізацыя дактароў, фэльдшароў, сясьцёр міласэрдных і дэзынфэктараў.

У апошнія дні ў Коўне зарэгістравана да 60 выпадкаў што дзень.

З Масквы паведамляюць, пастаноўлена пакараціць штаты служачых у савецкіх устаповах з 1 лютага. Па 6 народным камісарыатам лік служачых будзе пакарочаны з 660 тысячаў да 275 т. чалавек у Сапархозе з 100 тыс. застанецца 40 тыс., у наркампродзе з 120 т. —50 т. і т. д. Усе гэтыя служачыя будуць выкінуты без усякіх сродкаў на вуліцу.

ХРОНІКА.

Выпадак з дзеўчынай.

У зьвязку з частымі таёмнымі зьнікаваньнямі людзей ў Вільні, інтэрэсны выпадак меў мейсца ў мінулым тыдні.

Дзеўчынка 9 гадоў (Родзівічуўна, вул. Троцкая № 18) йшла з школы дамоў. Неспадзейна яе хапіў за руку якісь мужчына і кажучы „хадзі, ты такая маленькая, я цябе правяду да хаты“... паташчыў павуліцы. Дзеўчынка пачала вырывацца, але мужчына моцна сьціснуў яе ручку і не выпускаў... Тады дзеўчынка пачала галосна крычаць аб ратунку і мужчына, спалохаўшыся, адпусьціў яе...

Заграні́чныя паспарты.

Заграні́чныя паспарты абложаны гербавым зборам па 6000 марак кажды.

Дадатковы акцыз.

Дырэктар Дэпартамэнту Скарбу выдаў распараджэньне № 452, згодна якому ўсе запасы сьпірытусу і гарэлкі, находзючыяся ў складох водачных вырабаў і ужо аплачаныя акцызам, падлежаць дадатковаму абкладаньню: 1) Чысты сьпірытус па 1500 марак за літр 100 гр. альбо 192 маркі ад 1 градуса вядра і 2) гатовыя водачныя вырабы па 780 мар. за літр гэтых вырабаў.

Дадатковае абкладаньне пашыраецца на водачныя вырабы знаходзючыяся у магазынах, рэстаранах і у прыватных асоб, маючых балей як 5 літраў.



Тыпы Палесься.

5. Белашапка.

У паўдзень мы з Ганчаром зайшлі да якогась хутара ў лесе. Уся хатка гаспадара была абсажана яблынкамі, грушамі, вішнямі, сьлівамі і іншымі фруктовымі дрэвамі.

— „Хто тутака жыве?“ запытаў я.

— „Хто жыве?“ перапытаў мяне Ганчар, „авось угледзіце самі...“

Праўда праз хвілю я ўгледзеў чалавечка маленькага росту, ў белых нагавіцах і сьвітцы.

На галаве была саломеная шапка.

Загарэлы твар, рэдкая барадка і вусы рабілі яго твар трохі сьмяшным.

— „А, Ганчар здароў, здароў!“ замахаў шапкаю гаспадар хутара ўгледзеўшы нас,

„Захоцьце, захоцьце!“ крычаў ён, падбягаючы да нас.

Мы прывіталіся. Гэта быў ўсім вядомы Белашапка, пра якога хадзілі паголоскі ў вокрузе, як пра чалавека вучонага і добра знаючага гаспадарку, асабліва садаводства!

— „Ось тутака пад яблынкай добра будзе... Садзецеся калі ласка...“ сказаў ён, паказаўшы на лаўкі і столік.

„Сядайце, а я хутка прынясу мёду і малака...“ крыкнуў ён і пабег у хату.

— „Вось гэты чалавек,“ пачаў Ганчар — хоча зрабіць па ўсей зямле фруктовы сад,“ з усьмехам закончыў ён.

— „Як так?“ зьдзівіўся я. „А вось запытайце.. Вось ён сам!“ сьціснуўшы плячмі, сказаў Ганчар.

— „Ну вось мёд, малако, сыр, хлеб, лыжкі, шклянкі!“ казаў Белашапка напоўняючы стол частушкамі.

— „Дзякую, дзякую!“ казаў я. „Добры ў вас садок!“ Пахваліў я азіраючыся на сад.

— „А, добры, добры!“ ажывіўся Белашапка на мае словы.

— „Гэта што! пачаў ён размову:“ Вось каб мне ды балей зямліцы гэтак з дзесяцін 30, дык вось паглядзелі-б які сад я развёў-бы! Былі-б у мяне ўсялякіх гатункаў і яблычкі і грушкі, сьліўкі, вішні, чарэшні ўсягоб насадзіў, завёў бы пітомнік, школку. А там набраў-бы хлопцаў з вёскі, вучыў бы іх садавоцтву, ды ня па вучонаму, а па свайму...“

Я паглядзеў на яго. „Так, так“ загарачыўся ён. і ўся яго маленькая фігурка затраслася.

Ен замахаў рукамі і чуць ня крычаў!

Так, па свайму, ня павучонаму. Вучоныя аграномы ўсё што мне казалі!

„Вось напрыклад на конта гэтай яблынькі“ паказаў ён на яблыньку, любоўна глянуўшы на яе — „Вось казалі, што яна засохне, а тым часам, гляньце ня толькі ня засохла, а навет плады вось дае. А бачыце, што вучоныя, вучоныя толькі псуюць!“ саўсім раскрычаўся Белашапка. „Вось вы гляньце“ навокала лес, дзіч, сосны елкі, дубы, асіны, а што-б была, каб усе былі яблынькі ці грушкі? а?“

Пытліва ён глянуў на мяне. „Рай быў бы, а?“ пытаў ён далей.

„Ня рай, а нуда!“ плюнуўшы сярдзіта раптам адказаў Ганчар.

—„Яя нуда? Сад! Яблынькі, грушкі,—нуда?!“ Наваліўся на яго Белашапка, і між імі завязалася гарачая спрэчка.

«Эх ты, шэры!» ругаў яго Белашапка.

Нуда! Дык горшай няма нуды як сядзець сярод дзікага лесу! Эх ты, культуры ня ведаеш!» Заключыў ён.

„А ну цябе з культурай!“ агрызнуўся Ганчар. „Я толькі ведаю, што лес для мяне лепш тваёй культуры і саду“.

„Дзікі лес лепш за сад? Не, не браток!“ ледзьве не з бойкай палез на яго Белашапка. «Ды ведаеш ты, што Гасподзь і той сад садзіў, а? ведаеш, ведаеш?» наступаў на яго ён.

„А ну цябе!“ Адхінуўся ад яго Ганчар. „Па твойму сад рай, а па майму лес. Ну дык і застанемся кожны пры сабе“... Закончыў ён.

Але разышоўшыйся Белашапка, ўсе стараўся даказаць сваё, і каб мацней ўкалоць Ганчара хрыпатым фальцэтам, глянуўшы на мяне, сказаў:

— „Вось, далібо, заўтра, заўтра, раніцай пачну лес секчы! Вось пабачыш!“

Пры гэтых славох Ганчар ускочыў, выпрастаўся і бьючы сабе жменяй ў грудзі, грозна сказаў: „Слухай Белашапка! Калі ты хоць на хвілю зьявішся з сякерай ў лес, дык глядзі наракай на сябе, я мазы ня даю....? Дый і саду тваймў тады ня здабраваць“, дадаў ён.

„Ага!“ ўзвізнуў Белашапка здаволяны, што праняў такі Ганчара і зарагатаў.

А Ганчар стаяў, насупіўшы вочы і грозна наглядаў на рагочучага Белашапку.

— „Ну, ну, сядай сябар, чаго там! зьмяніўшымся голасам, і ўжо ласкава, загаманіў Белашапка, падходзючы да Ганчара.

„Сядай, сядай, я так браток, пажартаваў.. Ня парушу я лесу... Гэта ў нас заўсёды бывае“, зьвярнуўся ён да мяне.

«Вось як сайдзёмся, дык і начнём— я пра сад, ён пра лес....

На хвілю замоўклі....

Дзесь высока заліваўся яскронак на рожныя лады. Сьвярашчалі малінаўкі, чыжы ў галінах яблыняк жужжэлі пшчолкі на красках зьбіраючы мёд... Усё жыло! Усё хваліла Даўшага жыцьцё.... Ветрык ласкава калыхаў галіны дзяраў, быццам цалаваў кожную краску, і далей ляцеў заставіўшы белую бярозку зашамацець усімі лісткамі, крануў высокую ёлку, якая пагарда кіўнула яму на разовітаньне вострай шапкай і зноў стала спакойна глядзець у высокае неба, з якога пасылала праменьня жыцьця далёкае сонца.

„Ну пара!“ перарваў цішыну Ганчар.

„Пойдзем сябар!“ зьвярнуўся ён да мяне. Я надняўся. Моцна сьціснулі адзін аднаму на павітаньне далоні.

— „Зямля—гэта Бджы дом“, замысьлёна сказаў Белашапка. „Праўда Ганчар?“ зьвярнуўся ён да яго.

Той глянуў на яго, на мяне і сказаў. „Хадзем!“

Мы пайшлі,

Белашапка доўга стаяў, глядзеў нам у сьлед і калі мы гатовы былі хавацца ў гушчары лесу, да нас даляцеў яго голас.

— „Праўда Ганчар?“

Той обярнулся, зьняў шапку і крыкнуў.

„Лес—праўда!“

„Так сама і сад!“ данясьлося да нас адпаведзь Белашапкі, калі мы былі ўжо ў лесе.

„Хай і сад!“ пракрычаў Ганчар. Ня ведаю, ці чуў яго Белашапка.

Я йшоў і думаў цікавыя яны людзі і колькі іх тутака захована ў лесе?

Мы йшлі. Лес шумеў, кланяўся нам сваімі зялёнымі шапкамі, і здаецца чуць прыметна казаў:

„Сярод маіх грудзеў знайдзеш, ты чалавек, спакой, балей нідзе“...

6. Вогнішча.

Ужо сонца праменьня сьвяцілі чырвонай вячэрняй зарой, калі мы з Ганчаром селі адпачыць сярод трох вялікіх дубоў.

Гангар любоўна агдядзеў дубы, памацаў іх рукой і сказаў:

„Добрыя дубы! мусіць разам расьлі, стаяць друг для дружкі, як родныя браты!“

І праўда дубы расьлі адзін ля аднаго на роўным растанку, робючы пасярод сябе вельмі прыемны пакойчык у тры вуглы з розніцай той, што ў гэтым пакойчыку замест суфіту, быў зялёны, густы пакроў з іх лісьцяў і галін і замест лавак і стала былі тоўстыя карэньня, на якіх мы паважна расселіся.

— „Вось, бачыце, як добра!“ задаволены загаманіў Ганчар, дастаючы з торбы сала, хлеб і бутэльку з самагонам... У лесе усё магчыма знайсьці: і хату і стол, і лаўкі і яду“ пачаў ён лічыць— „дый ште там гаманіць—лес гэта ўсё, каб лесу ня было-б, дык вось, далібо, ня жыў-бы на сьвеце, а ні воднай хвілі“..., закончыў ён, наліваючы гарэку ў бярастовую пекную чарку.

„Вось маеце!“ казаў ён—пеце да мяне.

Я выпіў. Самагон быў добры.

„Пасьля аднэй ня закусываюць“, сказаў ён і наліў нругую чарку і гэтая апынуліся тамака, куды пайшла першая.

„Вось гэта панашаму“, ўсьмяхаючыся сказаў Ганчар, выпіваючы чарку за чаркэй, кракнуў і пачаў есьці.

Ужо нашая вячэра падыходзіла да канца, калі Ганчар раптам з трывогай агляуўся і пацягнуў паветра носам.

„Гм“..., прабурчаў ён... Здаецца нешта дзесь гарыць, сказаў ён, падняўшыся з месца. „Так і ёсьць дзесь гарыць лес!“ сказаў ён і пачаў хутка складаць у торбу харчы.

Відаць была па ім, што ён быў моцна ўзбураны.

Я ледзьве пасьпеваў за ім. Сонца ўжо зайшло, і цені станавіліся ўсё гусьцей і гусьцей. Надыходзіла ночка. Але цемната ня шкодзіла Ганчару ісьці туды, адкуль ён учуў пах гарэлага лесу.

Ужо добра была чуць пах дыму, і нарэшце мы апыніліся сярод палянкі, з якой валіў дым, а агню ня было відаць.

„Эй, хто там?“ крыкнуў Ганчар здымаючы стрэльбу.

„Свае!“ адазваўся спакойна голас з-за клубаў дыму.

„Чаго-ж ты гэтакае вогнішчэ разлажыў?“ Ідучы на голас гаманіў Ганчар.

„Якое гэта вогнішчэ — калі агню няма!“ спакойна адказаў голас.

„Ты мусіць сырых галін нарубіў!“ няспакойна забурчэў Ганчар.

„А мо цябе баяўся, што?“ адказаў голас.

Нарэшці мы падайшлі да кастра бяза агня.

„Ну шчасьце твае!“ задаволены сказаў Ганчар вітаючыся з ім.

„Што шчасьце?“ пытліва зірнуўшы на яго загаманіў чалавек.

„А тое, што ня галіны, а моху наклаў“ адказаў Ганчар.

„Га, вось яно што! Гэта, браток, ад камароў!“ адказаў чалавек.

„Гэта, сябар ахвотнік Караба“, сказаў мне Ганчар. „Пазнаёмцеся!“

Мы пацiснулі адзін другому моцна далоні...

Дзяргач.

Абвестка.

Згублена

20 сьнежня 1921 году засьведчэньне на імя паручніка Гузнея Якуба, выданае праз Dowództwo Obozu internowanych w Dorohusku za Nr. 100 od 18 maja 1921 roku.

Знайшоўшага прашу вярнуць у Рэдакцыю.

Рэдактар-Выдавец: Вацлаў Адамовіч

Друкарня „Друк“ Субач 2.